проза

Анатоль Кірвель



...людзі не сьляпыя –

бачаць бяду...

# Піцерскія эцюды

## ДЗЕД МАРОЗ І СНЯГУРКА

Ну, й Новы Год! Макрэдзь, дождж... На маёй памяці толькі аднойчы так было – недзе ў семдзясят другім, – і дзе? На Поўначы! У Карэліі... І тое засталося ў памяці, як дзіва, якому нават і не шукаў тлумачэньня...

А цяпер? Цяпер – дык усё нашае жыцьцё як выключэньне – з усіх магчымых і немагчымых правілаў, усталяваных продкамі і часам... Сказаў бы каму раней, што стрэну Новы Год з дажджом, – засьмяялі б! А цяпер – і ня зьдзівяцца: самі праз гэткае прайшлі – праз катаклізмы гэтыя... І жывуць жа... некуды рухаюцца...

...Ішоў гэта я, значыцца, акурат трыццаць першага, бавіў сябе думкаю, што вось яшчэ колькі там гадзінаў, і паляцяць у столь коркі ад шампанскага, за-

зьвіняць чаркі ці келіхі, і сплыве ў нябыт ня надта й шчасьлівы нуль чацьвёрты, высакосны, хай яму, як кажуць, пухам, бо ён, вычварнік, ня толькі бедаў на нашыя галовы натрос, а й пачаставаў у апошнія хвіліны свайго панаваньня дажджом, а ня сьнегам...

Сьнегу, праўда, хапала, мокрага і нетрывалага – як па вясьне, – а там, дзе людзі тупаюць, – і зусім кісель – хіба ж гэта зіма?!

А йшоў да знаёмых – павіншаваць са сьвятам ды падарункі навагоднія аддаць, бо што ж гэта за сьвята без падарункаў, ды бяз Дзеда Мароза?!

Мне і прычындалы дзедавы – барада там сівенькая ды ўсё астатняе – непатрэбныя былі – сваю меў, хай і куцую, бы зайцаў хвост, але не куплёную – сам яе гадаваў ды песьціў, – а што бялюткай зрабілася – дык не маладзенькі ўжо – якраз пад дзеда-марозаў узрост...

Іду сабе, па сьнезе раскіслым порсьценька чвэкаю, у двор мікраараённы між тым забраўся, вунь і пад'езд са знаёмымі дзьвярыма відаць, яшчэ пару хвілінаў – і я на месцы. І тут раптам збоч сьцежкі – а йшоў краёчкам яе, выбіраючы цалейшую дарогу, – ледзь не наляцеў... на каго б вы думалі? – на... Сьнягурку, ага!.. На сьнег кардонку таўставатую паклала, – крама гарэлачная непадалёк, дык там гэтага дабра навалам, – паўзьверх кардонкі – коўдру байкавую ў чатыры столкі... Сама ў кажусе, рудавата-шэрым – пэўна, ня першы год на плячах; хустка на галаве даматканая – у карычневую з сінім клетку, – а на руках, у коўдрачцы – ці то немаўля, ці хтось трохі старэйшы – адно носік кірпаценькі вытыркаецца... Счырванеў трохі – сагрэць хочацца... Вось табе і Сьнягурка!

Маладзіцы шчэ і чвэрткі, пэўна, няма: мо толькі за дваццаць перавалліла... Бровы чорныя, уразьлёт – так і паляцеў бы за імі! Твар – смуглявы, але не ад загару, колер свой, прыродны... А вусны – што мастак намаляваў, каханку сваю ўвасобіўшы: рэзка акрэсьленыя, сьмелыя, бяз горычы – ну во нібыта толькі што ад грады адарвалася, галаву ўзьняла і на цябе зірнула – адкуль ты гэтакі прыцёгся?!

А яна адкуль?

Па прыкметах, што ў вочы кінуліся, пэўна, з Малдавіі – тыповыя вельмі рысы... І што ёй тут рабіць, у далёкім Піцеры, седзячы на раскіслым сьнезе пад самы Новы Год?

Трохі збоч, на коўдры, прымасьцілася бляшанка ад стаўрыды, а ў ёй – як казалі даўней – пару медзякоў, у сэньсе рублёў (на Беларусі гэткіх, металічных, не ўжываюць), ды адна сіратлівая паперчына – дзясятка скамечаная, але ніякага звыклага нам і накрэмзанага абы як – “*Мы не местныя*...” (а далей – варыяцыі адпаведна густу і адукаванасьці) – такога побач з ёй не заўважалася... Ды й непатрэбныя былі тыя пазнакі – і так зразумела, чаго сядзіць...

Зноў-такі – горычы на твары не было: не надарвалі жыцьцёвыя клопаты ды нягоды негарадское, здаровае ад прыроды цела, дый маладосьць брала сваё! – аднак і штучна прыладжанай маскі беднацтва таксама не праглядалася: мо шчэ ня зьмерзла добра, а мо, дзіцятка люляючы, пра нешта сьветлае ўспомніла...

Ня “профі”, падумалася ў той момант, але момант – каб кінуць у бляшанку тое, што нібыта муляе ў кашальку, – быў страчаны: надта хутка тупаў, баючыся спазьніцца, а вяртацца – каб споўніць сьвяты чалавечы абавязак – не пакрыўдзіць таго, хто просіць, – азначала б у маім

выпадку адразу запісацца ў прытворшчыкі: людзі ж наўкола! То, пэўна, прыкмецяць і, пэўна, пахваляць... А бадай што й раскусяць, хто ж я такі на справе: во, гляньце, вярнуўся, сумленьне, пэўна, заела... а чалавек, відаць, усё-ткі харошы... навошта яму ўпікаць?! Праз тое і не вярнуўся: каб не ўпікалі... ні добрым, ні дрэнным... Які ўжо ёсьць...

Зайшоў да знаёмых, падарункі аддаў, пасядзелі трохі, а, назад вяртаючыся, прымяркоўваю, як мне лепей дахаты дабрацца: на метро ці на аўтобусе... І нейк не ў галаве, што, яшчэ ў госьці ідучы, паабяцаў сам сабе на зваротным шляху кінуць які рубель у бляшанку... Не набытак для Сьнягуркі, а ўсё ёй весялей... А пад успаміны пра нядаўнюю сустрэчу зноў праскочыў міма... Краем вока толькі прыкмеціў, што донца ў бляшанцы – скрозь у “медзяках”, ды й паперак ужо не адна, а на твары Сьнягурчыным – нават нейкая радасьць: мо ад таго, што недарэмна сядзела, і муж-малдаванін, калі падлічыць заробак, злаваць ня будзе...

Але ж праскочыў, не спыніўся! Вось табе і абяцанак! І падумаў, няўжо ж я гэтакі скнара?! Не сказаў бы! Я ж усім, каго ведаю і люблю, падарункаў да сьвята нарыхтаваў... А во цяпер нат Дзедам Марозам прыкінуўся, які тыя падарункі па хатах разносіць... Дачушка мая, напэўна, узрадуецца, убачыўшы тое, чым хацеў яе зьдзівіць і парадаваць, – мне й самому падарунак падабаўся... Усхопіцца, дзякуй, скажа, татачка!..

А Сьнягурка? Так і будзе сядзець на мокрым сьнезе і чакаць з далёкай Малдовы... ды не – не падарунку! – вестачкі хаця б... што ўсе яны там, пад сваім няласкавым пякельным сонцам, што робіць скуру смуглявай, а душу... душу пакідае гэткай, якую хто мае... дык яны ўсе там, дзякуй Богу, жывыя і здаровыя і ёй таго ж самага жадаюць...

## КАРГА

Ну, гэткая шчырая – проста страх! І падлічыць хуценька, і ўсьмешачку зычлівую ахвяруе... Не касірка, а золата! Нікога не затрымае... Адно блага: як падасі ёй, колькі скажа, капеек за хлеб ці батон, ды не буйнымі, а дробнымі – па пяць, па тры, а то і па адной капеечцы, – дык не – ня вызьверыцца, а гэтакай ласкавенькай усьмешачкай адорыць, што расцьвіцеш, нібы кветачка, а яна дадасьць – быццам і не табе, а так, увогуле:

– Што? На цьвінтары наскроб?

І не зразумець было, чаго болей у яе пытаньні: цікаўнасьці, звычайнай канстатацыі факту, альбо насьміху – таго ветлівага інтэлігентнага зьдзеку, якім так часта карыстаюцца піцерцы, калі жадаюць падкрэсьліць тваю недалікатнасьць або невуцтва, а яна ж была, па маім уяўленьні, “укаранелай” – як я жартаваў, кажучы замест агульнапрынятага “карэннай”, – ленінградкай, а я, не “ўкаранелы”, а проста “прышлы”, злаваў на яе, таму што гэтымі словамі яна нібыта раўняла мяне з жабракамі, якіх я бачыў шмат дзе, і хаця ўсе яны былі розныя, мелі аднак адну і тую рысу: не хацелі працаваць. Былі сярод іх і калекі, але я не пра іх, а пра тых, на кім можна было ваду вазіць – без асаблівай шкоды для іхняга здароўя. Я не кажу, што я Геркулес і што здароўю майму можна было б пазайздросьціць, але ад працы я ніколі не адмаўляўся: ня маючы яе, адчуваў сябе блага.

І во раптам – я з тых самых! А што табе проста надакучыў бразгат тых самых медзякоў у кішэні, і ты вырашыў падсунуць іх ёй – усё роўна будзе здаваць у банк, – яе, па ўсім, вельмі мала цікавіла.

Была ў яе, праўда, адна адмеціна, якая не дазваляла мне адказаць крыўдай на крыўду: з твару прыемная і нібыта не дурная, хадзіла яна... як бы гэта дакладней сказаць... карацей, сагнуўшыся ў тры пагібелі – хвароба ёсьць такая, перадаецца, бывае, і праз тры пакаленьні, або калі дзе ўпаў ці, пасьлізнуўшыся, зашчаміў пазванкі – горшай бяды і не прыдумаеш: нібыта й нармальны чалавек, а ходзіш, галаву задзіраючы, каб людзей бачыць ці на слуп не наляцець. А як сядзела ў сваім высокім крэсьле за касавым апаратам, дык і не было заўважна тае бяды.

Можа, я і адказаў бы нейкім чынам на ейныя папрокі, ды стрымліваў мяне адзін успамін з дзяцінства: праз нашу вёсачку раз ці два на тыдзень хадзіла ў гарадскую краму па хлеб ці цукар ужо, мне тады здавалася, старая кабеціна, якую мы, дзеці, вельмі баяліся: яна хадзіла гэтаксама, як цяперашняя мая знаёмая з булачнай. Яна безуважна пазірала на нас, нібыта ня бачыла зусім, але гэтаксама пазірала і на дарослых, нібыта тыя былі вінаватыя ў ейнай бядзе, і бацькі палохалі нас Макарыхай, што калі мы ня будзем слухацца, то старая карга, як пра яе казалі ў вёсцы, забярэ нас і зробіць так, каб і мы хадзілі сагнуўшыся, і што ў нас вырасьце горб, як у яе. Гэты страх перад калецтвам уеўся ў нашую сьвядомасьць, і мы абыходзілі Макарыху і нават не дражнілі яе, баючыся кары.

І калі я ўпершыню ўбачыў сваю суседку не за касавым апаратам, а як яна ішла ўвечары дахаты, то не адразу сьцяміў, што гэта яна і ёсьць. Утаропіўся на яе, як на дзіва, і яна заўважыла гэта. Ласкавенькая ўсьмешка касіркі, з якой яна сустракала кожнага пакупніка, імгненна зьнікла: відаць, яшчэ жыла працаю і не пасьпела перастроіцца, а тут ёй стрэўся чалавек, якому яна ўсьміхалася, седзячы за касавым апаратам, і які ёй таксама ўсьміхаўся, бо адчуваў пэўную залежнасьць ад такой важнай асобы – палаешся з ёй за тое, што падсунуў медзякі, дык яна і затрымае чаргу, і ўсе шышкі паляцяць на цябе, дык лепей змаўчаць ці ўсьміхнуцца... А тут, на вуліцы, яе ўлада канчалася, і яна сама пра гэта ведала і праз тое не здароўкалася ні з кім, хаця сваіх штодзённых пакупнікоў ня блытала з выпадковымі, але з тымі было прасьцей: ніхто ня бачыў яе так, як маглі бачыць мы, сустракаючы на вуліцы, і яна ставілася да нас ня тое каб з варожасьцю, але без асаблівай прыхільнасьці – той самай, якая ўзьнікае паміж людзьмі, якія жывуць на адной вуліцы ці ў адным доме. Нібыта не хацелася ёй падзяліцца з намі сваёй бядой ці ўбачыць спачуваньне на нашых тварах. Так і той раз: вочы пахаладнелі і адпіхнулі мяне – маўляў, я цябе ня ведаю, – і я моўчкі праглынуў яе непрыязь, аднак адразу прыгадаў каргу Макарыху з дзяцінства. Праз гэта і пачаў зваць касірку “каргою” – у думках, канешне, – але калі прыходзіў у краму і бачыў яе за шкляной вітрынкай, дзе яна сядзела на высокім зэдліку, знарок зробленым для яе, то ня мог паверыць, што тая, каторую я сустрэў увечары, і тая, што па-маладому трэсла сваімі прыгожымі кудзеркамі, усьміхаючыся пакупнікам, гэта адна і тая асоба.

А потым я пабачыў яе з дзіцячай каляскай – унучачка ў яе нарадзілася, амаль разам з маёй дачкой. А калі ў цябе малыя дзеткі, то ты імгненна заўважаеш, што ў некага – гэткія самыя малыя, і паміж, зда-

раецца, зусім незнаёмымі людзьмі ўзьнікае нейкае супольніцтва – пачынаеш цікавіцца, як дзеткі растуць, што ўжо ўмеюць, і чалавек робіцца табе бліжэйшым – нібыта ўжо свой... Так і з нашай касіркай: мы ўжо віталіся, везучы ў калясках сваіх “ненаглядных”, ды распытвалі пра іхнія “посьпехі”.

Мо і пасябравалі б мы з ёю – як пачынаюць сябраваць суседзі, у якіх знаходзіцца нешта агульнае, – ды праз некаторы час перастала яна раптам пра ўнучку расказваць, зірнула на мяне з прахалодаю, быццам я сказаў якое глупства. А якое ж гэта глупства – спытаць пра самага дарагога для цябе чалавечка – пра дзіцятка?! А як ня хоча – то яе справа. Але нашто пазіраць на мяне так, быццам я ў яе нешта ўкраў?

А дзён праз колькі ўбачыў яе ва ўсім чорным. Вочы сухія, невідушчыя, а як стрэне каго – не тарганецца анічогенька на твары, адно ў вачах ці то злосьць, ці то крыўда.

Так і не даведаўся я, што з ёю адбылося. А потым яна на пенсію пайшла і зусім перастала вітацца з людьмі. Стукае кіёчкам па асфальту і шкандыбае памалу. У каргі Макарыхі таксама кіёчак быў, але драўляны – з сухой крываватай палкі. А ў гэтай – лёгенькі, з бамбуку, ды з металічным наканечнікам, які і цокаў па асфальту нейк бяздушна – нібыта папярэджваў: не чапайце мяне! Адстаньце! Мы і не чапалі... Можа, так чалавеку лягчэй...

Неяк прыехалі да мяне госьці, і я мусіў быць гідам. Вадзіў іх па сваіх любімых мясьцінах – Летнім садзе, Міхайлаўскім, Марсавым полі, – схадзілі да Петрапаўлаўкі, дзе я напалохаў іх муляжом вартавога ў паласатай будцы – воскавы манекен быў як жывы, – а наастатак рушылі ў Аляксандра-Неўскую лаўру: жаданьне гасьцей – для гаспадара закон.

На шырокіх каменных прыступках там і тут стаялі ці сядзелі жабракі, якіх я не любіў яшчэ са школы. Тады, пасьля вайны, іх было ня так і многа, часьцей за ўсё калекі – хто без рукі, хто без нагі, – а на аўтобусным прыпынку, дзе заканчваўся наш маршрут, і дзе людзі чакалі чарговага рэйсу, амаль штодня ашываўся п’янтос Колька – гадоў пад трыццаць мужык, заўсёды няголены, у дзіравай ватоўцы, – і калі народу зьбіралася болей, пачынаў сваё “прадстаўленьне”:

– Дарагія брацьця і сёстры! Памажэце інваліду вайны... – ён тузаў плячом, і тады пусты рукаў ватоўкі матляўся з боку ў бок, але я ўжо ведаў, што ён абдурвае людзей: другая рука ў яго таксама ёсьць, і ён даволі спрытна куляе ёй чарку ў піўнушцы цагельнага заводу на ўскраіне Менску, адкуль я тэпаў у сваю вёску.

Я мала каго ведаў з тых, хто зьбіраўся на прыпынку, і сказаць ім, што ніякі Колька не інвалід, я, зразумела, баяўся – яго абыходзілі нават дарослыя мужыкі, – дзікая злосьць прачыналася ў нахабніку імгненна, ён роў, як разьюшаны бык і адразу лез у бойку, а што я, малеча, мог тады зрабіць – якія ў мяне былі сілы?! Толькі нялюба касавурыўся на яго ды марыў, што вось вырасту і тады ўжо... Але моманту гэтага так і не дачакаўся: Колька некуды зьнік, а разам з ім – і патрэба ў помсьце ці, лепей сказаць, у аднаўленьні справядлівасьці. Але сьлед свой у маім жыцьці ён пакінуў: праз яго і не палюбіў я жабрацкае племя: мне здавалася, што ўсе яны тым ці іншым чынам падманваюць людзей. Потым, пасталеўшы, пераканаўся, што часта так яно і ёсьць – абдурва-

юць, а той, хто сапраўды хворы ці нямоглы – стаіць моўчкі і не казырыцца няшчасьцем: людзі ж не сьляпыя – бачаць бяду.

А па цяперашнім часе, калі грошы – ня грошы, а Бог ведае што, жабракам зусім лафа: выстаіць дзянёк і тысячаў пяць ці дзесяць мае – нашто й рабіць гэткаму – высільвацца невядома за што!

І я, па звычцы, адвярнуўся ад іх: хай таўкуцца, калі выбралі сабе такі лёс. І раптам у вушы ўбіўся даволі знаёмы голас, які я ня мог зблытаць з якім іншым – чуў яго штодня, заходзячы ў хлебную краму.

Няўжо?

Я азірнуўся: непадалёк ад нас, на сярэдзіне прыступак, побач з нейкай тоўстай кабетай, стаяла... мая знаёмая і штосьці жвава пераказвала сваёй напарніцы. Шэранькі вязаны шалік, абкручаны вакол шыі, бярог колькі цяпла, бо цёмна-сіняя балоневая куртачка, відаць, ужо ня грэла, адно берагла трохі ад макрэдзі. Побач з імі, ля ног, на куцаватым дыванку, прыладзіўся нізенькі кошык бяз ручкі, сплецены з тонкіх пруткоў – у гэткіх кошыках падавалі на стол печыва ці цукеркі, – а цяпер у ёй валялася колькі жалезных рублёў ды пару папяровых дзясятак...

“Вось табе і медзякі, сабраныя на цьвінтары...” – падумалася мне, і я цікаўна зірнуў на былую касірку. Яна была весялейшай, чым тады, калі я сустракаў яе на сваёй вуліцы і распытваў пра ўнучачку, і аніякай горычы на яе твары не заўважыў: мусіць ёй заўсёды хацелася стаяць вось тут, на цьвінтары, і без асаблівых турботаў зьбіраць дармовыя грошы: лепшай пенсіі і не прыдумаеш...

Госьці мае крыху зьдзівіліся, што я так уважліва пазіраю на жабрачак; я схамянуўся, і мы пакрочылі далей. А калі выходзілі з храму, маёй каргі на прыступках ужо не было. То й добра, падумалася мне; можа, ёй таксама было б непрыемна, што я ўбачыў яе тут, на цьвінтары, і, як мне здавалася, трошкі спасьціг ейную таямніцу. Аднак таямніца хавалася ў іншым.

Калі мы праходзілі паўз тоўстую кабеціну, з якой зусім нядаўна размаўляла былая касірка, тая раптам гукнула:

– Пятровіч! Ці гэта ты?! – і кінулася напярэймы.

Я аслупянеў. І яшчэ больш зьдзівіўся, калі пазнаў у кабеціне колішнюю суседку з нашага двара: яна зьехала ад нас гадоў як ня дваццаць таму.

– Сяргееўна? – я памалу пазнаваў калісьці танклявы твар, вастранькі, задзёрты ўгору носік, які цяпер ператварыўся ў бульбіну, карыя хітраватыя вочы ў атачэньні набухлых чырванаватых павекаў, адно ўсьмешка засталася ранейшай – крываватай і недаверлівай. Некалі амаль што стройная, суседка выглядала цяпер старой непаваротлівай кабетай і, напэўна, сама адчувала гэта, таму што адразу пачала апраўдвацца:

– Бачыш, пастарэла... Хваробы даймаюць...

Я і раней ня надта прыхільна ставіўся да яе – палаяліся аднойчы з-за нейкай дробязі, – і таму перавёў размову на іншае:

– А дзе... – і не пасьпеў назваць, пра каго я пытаюся, але Сяргееўна сама здагадалася.

– Ася? – дык вось як звалі “каргу”! – Во толькі што разьвіталіся... У храм пайшла... Грахі адмольваць...

– Якія грахі? – спытаў я недарэчна.

– Ой, ты ведаеш, Пятровіч, якая з ёй бяда? Не-е? Яна ж унучку сваю

недагледзела! Нявестка ейная мусіла да бацькоў паехаць – маці памерла, – хацела дачушку з сабой узяць, але Ася адгаварыла: нашто табе, кажа, лішні клопат... Хай унучачка са мной пабудзе... Нявестка згадзілася: трэсьці малую па бездаражы – да іх у вёску нават аўтобус не хадзіў, – сапраўды не з рукі... Так і паехала адна... А на другі дзень малая і захварэла: скразьняк, мусіць, прахапіў... Ася, дурніца, урачыху ня клікала: спадзявалася, што сама справіцца: яна ўсе хваробы зёлкамі лячыла – у яе ўвесь пакой мяшэчкамі з сухімі лекамі завешаны... І ці то перабліытала што, ці ня так адвар нарыхтавала, але замест палёгкі яшчэ горай зрабілася... Малая і не крычала ўжо, а толькі цяжка дыхала, ды сьлёзкі каціліся... Ася суцяшала яе – казала, што вось мама хутка прыедзе і вылечыць, – а тая штось затрымалася – мо не было як дабрацца, – і Ася ня спала разам з малой, паціху люляючы яе на руках... На трэцюю ноч ня вытрымала і змаглася: сама не заўважыла, як заснула... А калі ачомалася – штось штурхнула яе ў сьне, – падхапілася... ды позна: унучачка ўжо ня дыхала...

Што й рабіць – ня ведала... Такі грэх – не ўратаваць дзіцятка... Што нявестцы казаць – як ёй у вочы глядзець? Хоць сама ў труну кладзіся... Нявестка прыехала, не сказала ні слова, спакавала торбу ды і ўпрочкі... Ася пісала ёй потым, але ні слоўца ў адказ... Нібыта й не было ніколі сьвякрухі ў яе жыцьці... Дык вось цяпер Ася і ходзіць сюды, грахі замольвае... А як замоліш?! Малога не дагледзець – гэта горш, чым дарослага пакрыўдзіць... Ейная жытка ўся нейкая бязладная: як была маладая, пазайздросьціла сяброўцы – адбіла жаніха, – а тая ці то нагавор на яе зрабіла, ці проста пракляла, дык аднойчы Ася пасьлізнулася – не зімой, а ў самае лета, і на роўным, як кажуць месцы, – дык пасьля таго яе і сагнула... Не адразу... паступова... І горб вырас... Невялікі, праўда, але жаніх ад яе адмовіўся... Хадзіла ў царкву, ды, мусіць, ня так малілася... ці не пра тое... Вось Ася і падумала, што ўсё гэта лухта... Нарадзіла ад якогась прышлага сынка... Той вырас, ажаніўся, а як вярнуўся з плаваньня ды пра дачушку сваю даведаўся, таксама ні слова не сказаў і паехаў да сваёй законнай... Так і жыве Ася адна... Адно ня верыць, што Божанька памагае... Я вось таксама стаю тут, але ў храм ісьці баюся... Чыстай трэба ісьці... А ўдвох – дык яно неяк весялей... Мо і дачакаемся калі...